**Мельнікава Т.М. (Мінск)**

# Матыў жыцця ў творчасці Максіма Багдановіча

Паводле сцвярджэння М. Бахціна, вялікія і важныя хранатопы могуць складацца з неабмежаванай колькасці дробных хранатопаў і матываў. Наяўнасць вялікіх і дробных хранатопаў, матываў у паэзіі М. Багдановіча робіць яе багатай, заўсёды актуальнай, непаўторнай, унікальнай, субстанцыяльнай. Субстанцыяльнасць заключаецца ў тым, што яго літаратурная спадчына звернута да жывога быцця, дзе асноўным з'яўляецца матыў жыцця. З пытаннямі жыцця і смерці ў паэтычным свеце М. Багдановіча непасрэдна звязаны катэгорыі часу і прасторы. Матыў жыцця змяшчаецца ў аб'ёмістым хранатопе дарогі.

Вельмі ёмістая назва зборніка вершаў М. Багдановіча «Вянок». Вянок – гэта плеценае ў выглядзе кальца ўпрыгожванне з кветак, лісця, галінак і г.д. Ужо ў V ст. да нашай эры вянок стаў агульнапрынятым сімвалам перамогі. У Рымскай імперыі вянкі ўручаліся як узнагароды. М. Багдановіч «уручае» вянок пераможцы сваім чытачам, беларускаму народу, Беларусі. Паэзія М. Багдановіча сцвярджае, што ва ўсяго жывога дзве ўзаемазвязаныя долі – быць смяротным і тым, хто жыве. Паняцце «нараджацца» змяшчае ў сабе катэгорыю «паміраць». Спыніць час, які нясе смерць, немагчыма. Паэт не бачыць жыцця па-за смерцю. Таму перамога над смерцю ёсць перамога жыцця («Прывет табе, жыцце на волі!..», «Блішчыць у небе зор пасеў...»). Жыццё кароткачасовае, таму М. Багдановіч праз мастацтва ўвекавечвае кароткія імгненні быцця на зямлі, перамагае смерць сваёй творчасцю.

Жыццё па Багдановічу – гэта Космас, неабсяжны і загадкавы Сусвет, спрадвечныя мары і памкненні чалавецтва да новых адкрыццяў і міжпланетных падарожжаў. Зямля, неба, сонца, месяц, зоркі, вецер, хмары, дождж, снег, раслінны і жывёльны свет – пастаянныя вобразы яго паэзіі, якія ўдакладняюць матыў жыцця.

М. Багдановіч супрацьпаставіў эпосе рэвалюцыйна-дэструктыўных рухаў пачатку ХХ ст. сваю адраджэнскую мадэль жыцця, якая ўключала пошукі «красы, светласці і прастору», клопат пра духоўнае багацце асобы («Рандо», «Актава», «Астры»). Па словах А. Смоліча, «з кожнага радка (М. Багдановіча. – *Т.М.*) глядзіць на вас мяккая, шчырая, акрыленая душа паэта, праз усё жыццё не меўшая іншага закону, апроч хараства, гэткая паднятая над зямлёю, над звычайнымі будзённымі справамі» [2, с. 97]. Матыў жыцця «ўводзіцца» праз вобраз васілька поруч з вобразамі жытнёвага поля і прыгонных слуцкіх ткачых («Слуцкія ткачыхі»). Гэты «цвяток радзімы» – сімвал беларускага нацыянальнага Адраджэння, сімвал жыцця беларускага народа, Беларусі, самога М. Багдановіча. Матыў жыцця пераплятаецца з прасторай Кахання, мацнейшага за смерць («Першая любоў», «Маркотна я чакаю...», «Ўчора шчасце толькі глянула нясмела...»); з прасторай Мацярынства (цыкл «Каханне і смерць»). Скразным матывам праходзіць тэзіс пра неўміручасць, усеабдымнасць, усемагутнасць мацярынства і ў людскім свеце, і ў прыродзе, і сярод міфічных істот. На фоне драматычных абставін развіцця беларускай культуры М. Багдановіч выяўляў драму ўласнага лёсу – хворага, нядужага («Даўно ўжо

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

целам я хварэю...»), але моцнага духам паэта, які прагне адрадзіць родную мову і культуру.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Максім Багдановіч. Пясняр чыстае красы : успаміны, артыкулы, прысвячэнні ; уклад. Т. Шэляговіч. – Мінск, 2011.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ